занскай групы Хрыстафора Камуратава, а вясной 1943 г. там размяшчаўся атрад імя Валерыя Чкалава.

Аднак знайшоўся ў Лесках і здраднік — Калістрат Гук. Люта ненавідзячы Савецкую ўладу, яе стваральнікаў і абаронцаў, ён не мог дараваць сваім аднавяскоўцам, што яны ўзгадавалі столькі актывістаў КПЗБ, а потым, у гады Савецкай улады,— адданых бальшавікоў, будаўнікоў новага жыцця. Менавіта з Лесак выйшлі інструктар ЦК КПЗБ Праскоўя Фёдараўна Дзмітрук, першы сакратар падпольнага Камянецкага РК КПЗБ Захар Мікалаевіч Грышкоўскі, сакратар падрайкома КПЗБ Антон Віктаравіч Цыбуля, сакратар падпольнай партарганізацыі Дзяніс Васільевіч Козел. Пра ўсё гэта Гук паспяшаўся далажыць сваім новым гаспадарам. Таму ўжо з мая 1942 г. фашысты пачалі распраўляцца з мясцовым савецкім актывам. Яшчэ задоўга да канчатковай расправы з лескаўчанамі гітлераўцы расстралялі тут 15 актывістаў, а 52 юнакоў і дзяўчат з Лесак прымусова вывезлі на катаржныя работы ў Германію.

Пра лясное партызанскае ўрочышча фашысты даведаліся таксама ад Гука.

Спачатку акупанты запланавалі на апошнюю дэкаду красавіка 1943 г. акружыць Кажэўню і знішчыць там усіх партызан. Аднак план гітлераўцаў праваліўся: партызаны своечасова пакінулі ўрочышча, перабазіраваўшыся на поўнач Белавежскай пушчы. Тады разлютаваныя няўдачай фашысты вырашылі адпомсціць усёй вёсцы, знішчыць людзей, а нарабаваную маёмасць падзяліць паміж сабой.

Аляксандра Дзмітрук, якая цудам уцалела ў той жахлівы дзень, нават праз многа гадоў не можа стрымаць хвалявання, расказваючы, з якім педантызмам і пунктуальнасцю акупанты праводзілі сваю «акцыю». Групамі па 8—10 чалавек (спачатку мужчын і падлеткаў, а потым жанчын і дзяцей) яны падводзілі людзей да ямы і расстрэльвалі. Сям'ю фашысцкага паслугача Гука ў дзень расстрэлу лескаўчан адправілі ў Германію.

За час акупацыі гітлераўцы спалілі ў Камянецкім раёне 31 вёску. Па даносах здраднікаў былі расстраляны дзесяткі савецкіх актывістаў, а ўцалелых жыхароў знішчаных вёсак вывезлі ў Кобрынскі і Брэсцкі раёны.

У 1960 г. у памяць аб ахвярах фашызму ў Лесках быў узведзены сціплы помнік, а 3 мая 1987 г. тут адбылося ўрачыстае адкрыццё новага помніка.

**М. МАМУС.**

# НЕРУКАТВОРНЫ ПОМНІК

**пакінуў пасля сябе Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік АН БССР Б. І. Сцяпанаў. Імя яго неразрыўна звязана з гісторыяй станаўлення і развіцця фізічнай навукі ў рэспубліцы. Ён займаўся тэарэтычнай спектраскапіяй, люмінесцэнцыяй, квантавай электронікай.**

**30 гадоў Б. І. Сцяпанаў узначальваў Інстытут фізікі, які ператварыўся ў вядомы навукова-тэхнічны комплекс і займае ў савецкай навуцы прызнаныя пазіцыі. Тут выраслі высокакваліфікаваныя кадры даследчыкаў, склаліся аўтарытэтныя навуковыя школы.**

**Акадэмік меў шырокія асабістыя кантакты з вучонымі розных краін, удзельнічаў у кангрэсах, канферэнцыях, сімпозіумах, чытаў лекцыі, выступаў з дакладамі. Будучы ў камандзіроўках, заўсёды знаходзіў час, каб наведаць навуковыя і навучальныя ўстановы, сустрэцца са сваімі калегамі.**




**Б. І. Сцяпанаў удастойваўся шматлікіх узнагарод. Адна з іх — Залаты медаль імя С. І. Вавілава АН СССР — за фундаментальную працу ў галіне тэорыі цэнтраў. І вось новае сведчанне прызнання міжнароднага аўтарытэта вучонага: нядаўна ў Акадэмію навук БССР Сусветны савет па культуры прыслаў дыплом, якім Б. І. Сцяпанаў адзначаны за «яго выдатныя заслугі ў навуковай дзейнасці». Гэтай высокай узнагароды беларускі фізік удастоены першым у рэспубліцы.**

**Г. КАРЗЕНКА,**
**кандыдат гістарычных навук.**